**ВАЛАСЕ́НЬ**, паводле павер'яў, хатні дух, які ноччу трывожыць і пужае людзей у сне. Уяўляўся невялікай істотаю, парослай цёмнай, густой і доўгай поўсцю, з сяміпалымі далонямі і доўгімі пазногцямі. Ён ходзіць выпрастаўшыся. Мужчынам казыча насы і драпае кіпцюрамі па твары. Жанчынам і дзяўчатам кудлаціць валасы, хапае за грудзі, а то і навальваецца ўсім сваім калматым целам. Дзяцей В. таксама пужае: гудзіць ім у вушы, казыча пяткі. Нясе ў сабе рысы *Дамавіка* і тых міфічных істот, якія пужаюць людзей у сне (*Мара*, *Начніца*). Згадваўся на Вілейшчыне.

*Літ.*: Беларуская міфалогія / Уклад. У.Васілевіч. Мн., 2002. С. 31—32.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ